

## СТВАРАЛЬНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

*ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІЦЫ!*

*Прыміце самыя шчырыя і цёплыя віншаванні з Днём жанчын.*

*8 Сакавіка — радаснае і ўсімі любімае свята. Гэта дата з'яўляецца цудоўнай нагодай, каб яшчэ раз падзякаваць мамам і бабулям, жонкам і дочкам, сёстрам і калегам за мудрасць, дабрыню, працавітасць і гармонію, якімі яны напаўняюць наша жыццё, робячы яго больш яркім і шчаслівым.*

*Стваральная прыгажосць і актыўная жыццёвая пазіцыя, прафесійныя, творчыя і спартыўныя дасягненні, умение дастойна выхоўваць падрастаючае пакаленне — галоўныя рысы беларускіх жанчын.*

*У гэты святочны дзень жадаю, каб у вашых сэрцах заўсёды была квітнеючая вясна, а ў доме гучалі звонкія дзіцячыя галасы, панавалі любоў і ўзаемаразуменне.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.**


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

7 САКАВІКА 2020 г. СУБОТА № 46 (29160)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Захаванне памяці аб подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны — гэта тая аснова, падмурак, на якім мы будуем сваю дзяржаву. Дзякуючы такім людзям, старэйшаму пакаленню, мы сёння можам ствараць, жыць у мірнай краіне. Мы павінны памятаць гэта і перадаць гэтую памяць іншым пакаленням, моладзі, якая ідзе за намі. У нашай краіне праходзіць акцыя «Беларусь памятае», якая, я думаю, будзе працягвацца заўсёды. Мы зробім усё магчымае, каб гэтае свята — 75-годдзе Вялікай Перамогі — было запамінальным, у першую чаргу для нашых ветэранаў і моладзі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ДЗЯКУЙ ЗА ЎСЁ, ШТО ВЫ РОБІЦЕ ДЛЯ КРАІНЫ І НАРОДА»



Фота БелТА.

**Ордэн Маці з рук Прэзідэнта атрымала выхавальнік дашкольнай адукацыі Рабунскага вучэбна-педагагічнага комплексу Вілейскага раёна Ірына МІКУЛІЧ.**

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і генеральскія пагоны

**Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што цырымонію, якая традыцыйна праходзіць напярэдадні Дня жанчын, заўсёды вылучае адменная атмасфера ўрачыстасці і душэўнасці.**

«Яе ствараеце вы, жанчыны, сваімі ўсмешкамі, сваёй прыгажосцю, абаяннем. А бляск і цудоўны выгляд Палацу Незалежнасці надаюць парадныя мундзіры нашых ваенных. Сёння мы адначасова ўшаноўваем эліту арміі і сілавых структур — абаронцаў Айчыны, чыё свята мы нядаўна адзначалі, а таксама шматдзетных мам і жанчын, якія дасягнулі вялікіх прафесійных вышынь», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.


СТАР. 2


# УСЕ КВЕТКІ



Напярэдадні жаночага свята ў сталіцу з Пінска прыехала Таццяна ЗУБКО, каб наведаць сям'ю сваёй дачкі Анастасіі ГАЛАВІНОЙ і, вядома, маленькую ўнучку Алісу. Немаўляці споўнілася толькі чатыры месяцы, і дзяўчынка — першая ўнучка ў бабулі Таццяны.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Брэст да 8 Сакавіка ўпрыгожылі святлодыёдныя цюльпаны.**



- У вытворчасць запушчаны прыбор для праверкі якасці маторнага паліва за адну хвіліну.
- **Мінпрацы працягне працу над ініцыятывай павелічэння дапамогі за нараджэнне дзяцей з розніцай да трох гадоў.**
- Беларусы ў студзені — лютым купілі валюты на $172,8 мільёна больш, чым прадалі.
- **Касцевіч: жанчын у IT і сферы інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій ужо больш за 40 %.**


ISSN 1990 - 763X


Перадсвяточнае

# Камфорт, крэатыў... і музыка для рагуль

**Хто сказаў, што жывёлагадоўчы комплекс — гэта тыповае прадпрыемства, афармленае ў строгіх панурых колерах, змест і прызначэнне якога выдае спецыфічны пах ды аднолькавая форма работнікаў? Пералічанае — дакладна не пра калектыў комплексу «Макарава» сельгаспрадпрыемства «Макарава-Агра». У іх усё інакш: у памяшканні прыгожа, крэатыўна, музыка класічная грае, у калідоры карцінкі з рознымі пейзажамі на сцяне мяняюцца з дапамогай відэапраектара. Раней не даводзілася бываць на такіх фермах.**


СТАР. 5




**Галоўны заатэхнік Святлана ЛЯШУК.**

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

# «ДЗЯКУЙ ЗА ЎСЁ, ШТО ВЫ РОБІЦЕ ДЛЯ КРАІНЫ І НАРОДА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І такі гендарны баланс — гэта не імітаванне заходніх трэндаў. Высокі статус людзей у пагонах у нашай краіне і паважлівае, беражлівае стаўленне да жанчыны — базавыя каштоўнасці.

Асаблівыя словы ўдзячнасці ён адрасаваў шматдзетным маці, якія выбралі для сябе цяжкую, але надзвычай важную і патрэбную для краіны місію. Такія жанчыны клапоцяцца не толькі пра сваіх дзяцей, але даюць жыццё новым пакаленням, дораць надзею на паспяховую будучыню і росквіт усёй нацыі.

Большасць з гераінь цырымоніі не толькі шчаслівыя ў сям'і, але і сфарміраваліся як спецыялісты на прафесійным полі дзейнасці. І гэта, мяркуе Аляксандр Лукашэнка, удвая важна. Ушанавалі ў Палацы Незалежнасці жанчын, якія ўдастоены ўзнагарод і ганаровых званняў за высокія дасягненні ў галіне культуры, мастацтва, навукі і педагогікі, і чый уклад у выхаванне моладзі, захаванне духоўнай спадчыны і маральных каштоўнасцяў Прэзідэнт высока ацаніў.

Віталі ў Палацы Незалежнасці і нашых спартсменак, якім за бліскучыя перамогі на чэмпіянатах свету і Еўропы прысвоена высокае званне «Заслужаны майстар спорту».

«Дазвольце мне ад усёй душы павіншаваць вас з заслужанымі ўзнагародамі. Дзякуй за ўсё, што вы робіце для краіны і нашага народа. Напярэдадні цудоўнага вясновага свята самыя цёплыя віншаванні хачу адрасаваць жанчынам нашай Беларусі. Прыміце мае шчырыя пажаданні здароўя, шчасця і дабрабыту. Жадаю ўсім галоўнага: міру і дабра», — звярнуўся да гасцей Аляксандр Лукашэнка.

### Сакрэты поспеху

Дэкан факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Ірына Камарова, якой прысвоена званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», звярнулася да Прэзідэнта са словамі ўдзячнасці за высокую адзнаку сваёй працы.

Яна нагадала афарызм «Любоў да радзімы пачынаецца з сям'і» — асабліва актуальна гэта гучыць у Год малой радзімы. Заслужаны работнік адукацыі пажадала, каб дзеці былі шчаслівыя, радавалі поспехамі і дасягненнямі і раслі годнымі грамадзянамі Беларусі.

Згадаў аб сямейных каштоўнасцях і начальнік Універсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях палкоўнік унутранай службы Іван Палявода, узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені.

«Галоўны сакрэт поспеху — упартая праца і падтрымка родных і калег, дзякуючы якой у няпростыя хвіліны мы захоўваем вернасць доўгу і абраным ідэалам. Любыя мэты дасягальныя, калі ў грамадстве пануюць мір, стабільнасць і парадак. Сёння ў гэтай зале прысутнічаюць унікальныя людзі. Галоўнае, што ўсіх іх аб'ядноўвае, — гэта імкненне штодня служыць галоўнай мэце дзяржаўнага будаўніцтва, рабіць нашу краіну больш моцнай, а жыццё нашых грамадзян — лепшым і бяспечным», — упэўнены кавалер ордэна.

«Яшчэ раз віншую вас з высокімі ўзнагародамі — мужыкоў; нашых цудоўных жанчын не толькі з узнагародамі, званнямі, але і з надыходзячым святам. Будзьце шчаслівыя! І хай дзеці, якіх вы нарадзілі не толькі для сябе, але для нашай Беларусі — суверэннай, незалежнай — радуюць заўсёды вас і нашу краіну. Шчасця вам!» — звярнуўся да ўзнагароджаных Аляксандр Лукашэнка.

Пасля ўрачыстай часткі мерапрыемства адбыўся прыём ад імя кіраўніка дзяржавы.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Разгледжана на сесіі

# Стабільная эканоміка — гарантыя бяспекі

## На Брэстчыне падведзены вынікі работы і вызначаны задачы на 2020 год

**На сумесным пасяджэнні сесіі Брэсцкага абласнога Савета і абласнога выканаўчага камітэта разгледжаны вынікі выканання прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці на 2019 год і агучаны планы на год 2020-ы. У пасяджэнні бралі ўдзел дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Андрэй РАЎКОЎ, старшыня праўлення Нацыянальнага банка краіны Павел КАЛАУР, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ.**


Фота БелТА.

У сваім справаздачным дакладзе **старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС** паведаміў, што за мінулы год у эканоміцы вобласці атрымана 942 мільёны прыбытку — на трацціну болей, чым у 2018 годзе. Аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту склаў 12,5 мільярда рублёў з плюсам на 2,8 працэнта. І разам з тым было адзначана, што па гэтым паказчыку не дасягнутыя зададзеныя параметры. Тэмп росту склаў 102,8 працэнта пры прагнозе 104, прадукцыйнасць працы не дацягнула 0,7 працэнта да даведзенага на год паказчыка. Важным дасягненнем названа тое, што ўдалося забяспечыць паступальны рух усіх галін эканомікі. Атрыманы прырост па экспарце тавараў — 10,3 працэнты, што ўдвая больш за запланаваны. Рэгіён стабільна з'яўляецца лідарам па аб'ёме экспарту сельгаспрадукцыі і харчавання — за 2019 год гэты паказчык вырас на 10,9 працэнта.

На думку губернатара, важкі зазел для выканання пяцігадовай праграмы ёсць, але ж відавочна, што 2020 год будзе вельмі напружаны для вобласці. У першым квартале чакаецца станоўчая дынаміка, аднак, каб выканаць заданне па валавым рэгіянальным прадукце, тэмп росту ВРП сёлета павінен скласці не менш за 103,5 працэнта.

Кіраўнік вобласці звярнуў увагу на тое, што надвор'е дае магчымасць загадзя рыхтавацца да палявых работ, актыўна ўносіцца арганіка, вядзецца ворыва пад яравы клін. Аграрыі настроены асноўны ўпор зрабіць на кармавую базу, асабліва гэта датычыцца гаспадарак Ганцавіцкага, Лунінецкага, Івацэвіцкага, Драгічынскага, Маларыцкага раёнаў.

На пасяджэнні сесіі і выканкама таксама разгледжаныя пытанні сацыяльнага развіцця, занятасці насельніцтва. Адзначалася, што ў юбілейны для Брэста год абласны цэнтр прырос значнымі аб'ектамі інфраструктуры: шмат з'явілася іх у галінах адукацыі, аховы здароўя, фізкультуры і спорту. Разам з тым была засяроджана ўвага на развіцці турызму і паляпшэнні турыстычнай прывабнасці рэгіёна. Сёлета адным з прыярытэтаў стане развіццё сеткі турыстычна-інфармацыйных цэнтраў, што дасць магчымасць інфармаваць беларусаў і грамадзян іншых краін аб паслугах: экскурсіях, праектаванні тураў, пракаце, прапановах аб'ектаў харчавання. Усяго ў вобласці запланавана правесці каля 120 масавых турыстычных мерапрыемстваў. Міжнародны турыстычны форум чакаецца ў Брэсце ў красавіку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветныя біржы сыходзяць у піке



Новае зніжэнне біржавых індэксаў: фондавыя рынкі дзяржаў Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, у прыватнасці, Японіі і Паўднёвай Карэі, працягнулі падзенне. Гэта адбылося праз некалькі гадзін пасля сыходу ў рэзкае піке паказчыкаў на гандлёвых пляцоўках ЗША. Паведамляецца, што мацней за ўсё страцілі ў коштце карпарацыі, якія вырабляюць гаджэты і іншую электроніку. Індэксы Уол-стрыт ліхаманіла, яны праехаліся на «амерыканскіх горках» уніз, чым звялі на нішто моцны рост, які адбываўся дзень таму. Спецыялісты кажуць, што гэтая тэндэнцыя працягнецца, пакуль будзе штодня павялічвацца колькасць заражаных каранавірусам. Услед за азіяцкімі гандлёвымі пляцоўкамі з падзення пачала свой дзень і Парыжская біржа. Авось на біржах Кітая — пакольі эпідэміялагічная сітуацыя ў краіне, мяркуючы па ўсім, паляпшаецца — пануе стрыманы аптымізм.

### ЕС заклікае Турцыю адмовіцца ад шантажу

Колькасць мігрантаў, якія спрабуюць перасекчы мяжу паміж Турцыяй і Грэцыяй, і значыць, трапіць у ЕС, на думку афіцыйных Афін, складае 32 тысячы чалавек. Афіцыйная Анкара называла лічбу, у чатыры разы большую. Еўрасаюз настойвае, што Турцыя абавязана выконваць пункты пагаднення чатырохгадовай даўніны, калі ў абмен на закрытыя межы краіна атрымала не менш за 6 мільярдаў еўра субвенцый для дапамогі бежанцам. Анкара абвясціла, што адмовілася ад сваіх абавязацельстваў у сувязі з эскалацыяй канфлікту ў Ідлібе з-за пазіцыі, занятай па гэтым пытанні ЕС. На тэрмінова скліканым днямі пасяджэнні кіраўнікоў МЗС краін — членаў ЕС Брусель «катэгарычна адхіліў спробы выкарыстання міграцыйнага ціску для дасягнення палітычных мэт». У адказ на гэта Анкара абвінавадзіла кіраўніцтва Еўрасаюза ў тым, што новы транш фінансавай дапамогі да Турцыі не дайшоў.

### Амерыканскі акрабат прайшоў па канаце над кратэрам вулкана

Нік Валенда прайшоў па канаце, нацягнутым над кратэрам дзеючага вулкана Масая ў Нікарагуа. «Шпацыр» 41-гадовага смельчака над распаленай магмай трансляваўся ў прамым эфіры па адным з каналаў. Увесь шлях даўжынёй 550 метраў заняў у Валенды 31 хвіліну. Апошнія некалькі метраў акрабат на радасцях прабег, зняўшы пры гэтым маску, якая абараняе ад выпарэнняў. Пасля рызыкоўнага труку амерыканец сказаў, што больш небяспечнага праходжання ў яго жыцці яшчэ не было.

Блізкая ўлада

# Бяспека дзяцей — найперш

## Уладзімір Краўцоў правёў прыём грамадзян у Смаргоні

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама зрабіў акцэнт на пытаннях, якія датычыліся падвозу дзяцей у вясковыя школы, рэарганізацыі ўстаноў адукацыі, а таксама рамонту і стану мясцовых дарог.**


Фота БелТА.

Жыхар вёскі Навасёлкі, бацька пяцярых дзяцей, занепакоены сітуацыяй з падвозам дзяцей у школы. Ён паведаміў, што дарогі, па якіх курсіруе школьны аўтобус, не ў належным стане, іх неабходна падсыпаць, а абочыны скошваць. Але добраўпарадкаваннем займаюцца толькі пасля звароту ў мясцовыя органы ўлады — раённы і сельскія Саветы. І сам транспарт для падвозу пакідае жадаць лепшага, лічыць шматдзетны бацька.

Як растлумачыў **начальнік упраўлення адукацыі Смаргонскага раёна Ігар ШЧАСНЫ,** усяго ў раёне ў падвозе дзяцей задзейнічаны 11 аўтобусаў. Чатыры з іх эксплуатуюцца больш за 10 гадоў. Летась набылі два транспартныя сродкі. Уладзімір Краўцоў даў даручэнне палепшыць сітуацыю з транспартам і набыць сёлета новы аўтобус на маршруце праз вёску Навасёлкі, а таксама даследаваць усе дарогі маршруту і прывесці іх у парадак. Пытанні бяспекі дзяцей павінны быць на першым месцы і вырашацца неадкладна, падкрэсліў кіраўнік абласной вертыкалі ўлады.

Жанчыны, якія жывуць на вуліцы Савецкай, 15, у Смаргоні звярнуліся да кіраўніка рэгіёна з просьбай вырашыць пытанне па гарачым водазабеспячэнні. Дом, у якім жывуць заяўніцы, пабудаваны больш за 40 гадоў таму, але без праведзенай гарачай вады. Пасля шматлікіх зваротаў у кватэрах паставілі газавыя калонкі. Жанчыны просяць падключыць дом да цэнтральнага гарачага водазабеспячэння, якое ёсць у суседніх новых дамах.

Як паведаміў **дырэктар мясцовай ЖКГ Міхаіл НАЙДЗІЧ,** гэты дом — апошні пункт у цепласецты, таму ёсць праблемы з падагрэвам вады. Каб забяспечыць неабходную падачу цяпла, трэба замяніць цеплассеткі альбо падчас рамонту перавесці дом на электраацяпленне. Тады жыхары павінны адмовіцца ад газу і поўнасцю перайсці на электрычную энергію. Тэхнічна гэта магчыма, але пацягне за сабой павелічэнне аплаты нават з улікам ільготнага тарыфу. Ці будзе гэта жыхарам па сілах, калі улічваць, што тут пражываюць у асноўным людзі пенсійнага ўзросту? Таму пытанне на працягу месяца будзе вывучацца, каб зрабіць канкрэтны выбар з улікам тэхнічных магчымасцяў і пажаданняў жыхароў.

З пэўнай недарэчнасцю ў новых кватэрах сутыкнуліся жыхары райцэнтра па вуліцы Пагранічнікаў, 17. Лоджыі у некаторых кватэрах працякаюць, хоць дом здадзены летась і знаходзіцца на гарантыйным абслугоўванні. Па словах жыхароў, спецыялісты будаўнічай арганізацыі параілі ім зашкліць лоджыі, што яны і зрабілі. Але праблема не знікла — столі па-ранейшаму цякуць. На чарговы ліст з будаўнічай арганізацыі прыйшоў адказ, маўляў, трэба лепш праветрываць. Пры гэтым кампанія не можа вызначыць прычыну зацякання, нягледзячы на тое што яе спецыялісты непасрэдна займаліся праекціроўкай дома. Жыхары спадзяюцца, што зварот да губернатара дапаможа вырашыць праблему. Падчас прыёму быў зроблены званок кіраўніку будаўнічай арганізацыі, пытанне ўзята на яго асабісты кантроль. У бліжэйшы час будзе праведзена шчыльнае абследаванне, каб выправіць недарэчнасць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Парламенцкі дзённік

# АД КАНКРЭТНАГА ПАЦЫЕНТА ДА ЎСЁЙ СІСТЭМЫ

**Права на прафесійную рызыку замацуюць у абноўленым законапраекце аб ахове здароўя. Гэта права медыка разлічана на тое, што нават пры здзяйсненні ім маніпуляцый з выкананнем усіх методык і патрабаванняў магчымы незапланаваны вынік. «І гэта не з'яўляецца віной медыцынскага работніка, гэта асаблівасці пацыента, асаблівасці цячэння захворвання. І мы павінны ўвесці права на прафесійную рызыку, таму што ад гэтага ніхто з медыцынскіх работнікаў не застрахаваны», — адзначыў на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Прафесійная рызыка звязана і са страхаваннем, што дазваляе абараніць медработніка, забяспечыць кампенсацыю і захаванне законных правоў пацыента. Многія клінікі ўжо страхуюць сваіх спецыялістаў за кошт пазабюджэтных сродкаў.

Сярод навацый закона — замацаванне паняцця «якасць аказання медыцынскай дапамогі» і стварэнне сістэмы кантролю за меддапамогай. Па сутнасці, адбываецца пераход ад аналізу якасці канкрэтнай гісторыі хваробы да ацэнкі ўсёй сістэмы, для чаго ствараецца вертыкаль кантролю.

Законапраект уводзіць міжнароднае прызнанае паняцце «рэзідэнтура» — паглыбленае навучанне спецыялістаў, якое нагадвае ардынатуру. «Калі чалавек атрымлівае дыплом, што ён прайшоў рэзідэнтуру і здаў усе экзамены, дыплом прызнаецца ва ўсім свеце», — удакладніў міністр аховы здароўя. Асаблівай пастановай будзе вызначана, на якія спецыяльнасці можа атрымаць допуск той, хто толькі прайшоў рэзідэнтуру.

Развіваецца праз закон і электронная ахова здароўя. Шматлікія сэрвісы ўжо пераводзяцца ў лічбавы фармат. Практыкуюцца электронныя рэцэпты, прапануюцца тэлемедыцынскія кансультацыі ў рэжыме анлайн. Асновы іх юрыдычнага рэгулявання закладваюцца ў закон.

Сёння ў стацыянарных аддзяленнях медыкаментознае лячэнне праводзіцца за дзяржаўны кошт, а пры дзённым знаходжанні пацыенты аплачваюць яго самастойна. Па словах міністра аховы здароўя, гэта прыводзіць да таго, што пацыенты настойваюць на стацыянары, нават калі не маюць на гэта дастатковых паказанняў. З увядзеннем закона праблема будзе вырашана. «Мы лічым, што гэта не прывядзе да павелічэння расходаў бюджэту. Адбудзецца пераразмеркаванне. Магчыма, страты нават скароцяцца, бо ўтрыманне стацыянарнага ложка абыходзіцца даражэй, чым амбулаторнага», — сказаў Уладзімір Каранік.

Асаблівы раздзел законапраекта — медыцынская акрэдытацыя. «Многімі гэта было ўспрынята, быццам мы імкнёмся эканоміць фінансаванне і скарачаць ложкавы фонд, закрываць бальніцы. На самай справе, размова аб закрыцці нейкіх бальніц, медыцынскіх устаноў не ідзе», — запэўніў кіраўнік ведамства. Адзінае патрабаванне — спецыялізаваная дапамога павінна аказвацца там, дзе для гэтага ёсць адпаведная база, кадры і ўмовы. «Якасць аказання медыцынскай дапамогі не павінна залежыць ад месца жыхарства», — канстатуе Уладзімір Каранік.

Спецыялізаваная, высокатэхналагічная дапамога сканцэнтруецца ў міжраённых, міжрэгіянальных цэнтрах. Цяпер ідзе поўнае аснашчэнне гэтых медустаноў. Да 1 студзеня 2023 года сістэма павінна працаваць у поўным аб'ёме і ўсе ўстановы аховы здароўя пройдуць акрэдытацыю на адпаведнасць базавым патрабаванням. Медыцынскія ўстановы, якія не могуць аказваць на сучасным узроўні пэўныя віды дапамогі, пад іх аказанне акрэдытаваны не будуць.

«Гэта не значыць, што ўстановы будуць закрыты, яны будуць аказваць іншыя віды дапамогі: першасную, тэрапеўтычную дапамогу, амбулаторную хірургію, хірургію аднаго дня», — паведаміў Уладзімір Каранік.

Прапісаны ў законе навацыі, што маюць намер аб'яднаць адукацыйны працэс, навуковую, інавацыйную і клінічную дзейнасць. Клінікі, якія ўвасобяць у сабе ўсе складнікі, атрымаюць статус універсітэцкіх і набудуць цесную сувязь з ВНУ.

Як адзначыў профільны міністр, новаўвядзенні не разлічаны на тое, каб скарaціць адлічэнні на ахову здароўя. Наадварот, гэты фонд у бюджэце павялічваецца штогод. Нават пры сёлетнім яго дэфіцыце выдаткі ведамства прафінансаваны з павышаным каэфіцыентам.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Культасвета

# Год Фердынанда Рушчыца

150-годдзе з дня нараджэння вядомага беларускага мастака Фердынанда Рушчыца — ЮНЕСКА ўключыла ў каляндар памятных дат 2020-га. А днямі старт года жывапісца ўрачыста далі ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Ураджэнец сяла Багданава пад Валожынам праславіў родныя краявіды далёка за межамі нашай радзімы. Маючы за плячыма мінскую гімназію, ён паступіў у Вышэйшую мастацкую вучэльню пры Імператарскай Акадэміі мастацтваў Санкт-Пецярбурга. Тут трапіў у жывапісную майстэрню да галоўнага перадзвіжніка Івана Шышкіна, які навучыў асновам — «арыфметыцы і працы на натуры», а вось «алгебру», канструкцыю спасцігаў ужо разам з Архіпам Куінджы. Але не стаў прадаўжальнікам ні таго, ні другога — шукаў свой адметны стыль. Дыпломную работу Рушчыца «Вясна», у вартасцях якой сам мастак доўга сумняваўся, калекцыянер Павел Траццякоў набыў адразу ж на праглядзе работ студэнтаў Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу ў 1897 годзе. Пазней Фердынанд Рушчыц правёў персанальную выстаўку ў Вільні, дзе супрацоўнічаў з тэатрам і атрымаў званне ганаровага прафесара Універсітэта Стэфана Баторыя, шмат працаваў у Кракаве, дзе ўжо сам выкладаў жывапіс і стаў рэктарам Акадэміі вытанчаных мастацтваў, зладзіў першую выстаўку польскіх мастакоў у Парыжы, набыў вядомасць у Еўропе не толькі як жывапісец, але і як тэатральны дэкаратар, кніжны графік, педагог... Але ў беларускія фонды спадчына Фердынанда Рушчыца трапіла толькі ў 1957-м — карціну «Ля касцёла» набыла ў 1957-м першы дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Алена Аладава.




**Карціна «Каля касцёла» захоўваецца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

Не дзіўна, што сваім яго лічаць і ў Беларусі, і ў Польшчы, а таму заяўку на ўключэнне ў каляндар ЮНЕСКА падавалі сумесна. І гэтак жа разам зладзяць напрыканцы года міжнародны вернісаж Фердынанда Рушчыца, да ўдзелу ў якім запрошаныя таксама музеі Літвы і Украіны. Дарэчы, на сёння ў Беларусі знаходзяцца ўжо восем работ майстра сімвалічнага пейзажа, прычым тры з іх былі перададзеныя ў дар мастацкаму музею толькі летась дзякуючы пасольству Беларусі ў Швейцарыі і асабіста консулу Андрэю Нажэскіну — карціны выкупілі ва ўнука, мастацтвазнаўцы і экс-дырэктара Нацыянальнага музея Польшчы, поўнага цёзкі знакамітага дзеда Фердынанда Рушчыца.

Наогул у межах юбілейнага года запланавана многа мерапрыемстваў — гэта і новае выданне маляўнічага альбома ў «Беларускай энцыклапедыі», і выпуск памятнай манеты і паштовай маркі, і тэматычная «Ноч музеяў», і мастацкія пленэры (адзін з іх адбудзецца ў Багданаве, у Валожыншчыне і сабраў творцаў з Беларусі, Расіі і Малдовы), і навуковыя канферэнцыі і семінары, і турыстычныя маршруты да родавай сядзібы і магілы мастака ў Багданаве... Працы і натхнення хопіць на ўсіх ахвотных.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

75 Вялікая Перамога

# ЗЯМЛЯ З ПАХАМ ВАЙНЫ

Да міжнароднай акцыі памяці «У гонар агульнай Перамогі», прысвечанай 75-годдзю вызвалення Беларусі і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, далучыліся супрацоўнікі і курсанты **Магілёўскага інстытута МУС.** Яны правялі ўрачыстую цырымонію забору зямлі з брацкай магілы байцоў батальёна міліцыі і воінаў 394-га стралковага палка 11-й стралковай дывізіі, якая знаходзіцца пад Магілёвам каля вёскі Гаі. Падчас мітынгу **намеснік начальніка па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ** нагадаў курсантам пра неўміручы подзвіг абаронцаў, якія ўлетку 1941 года пад камандаваннем капітана міліцыі Канстанціна Уладзімірава цаной уласнага жыцця стрымлівалі тут мацнейшыя па колькасці і ўзбраенні сілы ворага.



Фота Марыны ГРАМЫКА.

Акцыі па заборы зямлі з месцаў воінскай славы і гібелі мірнага насельніцтва ў час вайны праходзяць па ўсіх раёнах Беларусі, пачынаючы з мая мінулага года. У мерапрыемствах бяруць удзел ветэраны, прадстаўнікі ўлады, працоўныя калектывы, моладзь. Гэта робіцца дзеля таго, каб нагадаць моладзі, якой цаной далася Перамога, і ўшанаваць памяць тых, хто ахвяраваў за яе свае жыцці. 9 Мая капсулы з зямлёй будуць змешчаны ў крыпту Храма-Помніка ў гонар Усіх Святых у Мінску для вечнай малітоўнай памяці. У праекце таксама бяруць удзел рэгіёны Расіі, Украіны і іншых краін блізкага замежжа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Крымінал, здарэнні

## Перавялі ашуканцам 12 тысяч еўра

**У міліцыю звярнуўся дырэктар гродзенскага прыватнага прадпрыемства. Ён заявіў, што пад выглядам фірмы-партнёра невядомы завалодаў яго грашыма ў суме 12 тысяч еўра.**

Як канстатуе УУС Гродзенскага аблвыканкама, злачынцы карыстаюцца тым, што ў наш час кампаніі працуюць у асноўным праз інтэрнэт — рахункі для аплаты тавараў і паслуг высылаюцца на электронную пошту. Зламыснікі ўзломваюць службовую пошту, дасканала вывучаюць перапіскі і ўсе рэквізіты пастаянных кампаньёнаў. Затым ствараецца аналагічная пошта, толькі з нязначным змяненнем у выглядзе адной літары або знака. І ўжо з гэтай скрыні прыходзіць патрабаванне аб аплаце з указаннем іншага разліковага рахунку. Бухгалтары, нічога не падазраючы, аплачваюць выстаўленыя сумы.

У вышэйназваным выпадку 12 тысяч еўра былі пераведзеныя неўстаноўленай асобе ў Стакгольм. Па гэтым факце праводзіцца праверка.

Дарэчы, летась пры аналагічных абставінах ледзь не пацярпела буйное прадпрыемства горада. Тады ашуканцы выставілі рахунак на 70 тысяч еўра. Улічваючы такую суму, супрацоўнікі банка звярнулі ўвагу, што на гэты рахунак фірмы з пералічэннях яшчэ не паступала. Дзякуючы гэтаму грошы зламыснікам не перавялі.

## Піраміда на мэблі

**Сапраўдную фінансавую піраміду стварыла жыхарка Сянно, калі працавала загадчыцай мясцовай мэблевай крамы.**

Падрабязнасці гэтай гісторыі паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама. Жанчына вырашыла ўзяць з касы на асабістыя патрэбы 8000 рублёў. Гасіць жа нястачу яна прыдумала вельмі арыгінальным спосабам: кліенты, якія прыходзілі па пакупкі, атрымлівалі мэблю ў крэдыт або растэрміноўку. Пры гэтым да неабходнай выплаты работніца гандлёвага аб'екта прыпісвала дадатковую, якая павінна была пайсці на пагашэнне запазычанасці. Таксама загадчыца ўпісвала ў рахункі мэблю, якая і зусім не рэалізоўвалася. Так, кліенты, якія нічога нават не падазравалі, павінны былі аплачваць акрамя сваёй пакупкі яшчэ і дадазены ў чэк іншы тавар. Як правіла, ім станавіўся мяккі куток.

Характэрна, што крымінальная схема, якая павінна была памяншаць нястачу, толькі павялічвала суму шкоды. Усё з-за таго, што жанчына брала для сябе грошы нават з гэтых выплат. У выніку за паўтара года сваёй дзейнасці жыхарка Сянно прысвоіла 24 тысячы рублёў. Па матэрыялах праверкі, якую правялі супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі мясцовага РАУС, у дачыненні да падазраванай была заведзена крымінальная справа. Суд прыгаварыў яе да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАЛІ ЗАМЕСТ ЗБРОІ — МІКРАФОН

**Канцэртная група ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны была створана не так даўно — у 2014 годзе. Але на яе ліку пераможныя ўдзелы ў многіх рэспубліканскіх і міжнародных творчых конкурсах. За час свайго існавання яна дала больш чым 370 канцэртаў, пераважная большасць з якіх прайшла ў аддаленых гарнізонах, у тым ліку ў Расіі. Сэрца групы — афіцэр па арганізацыі вольнага часу, начальнік клуба 483-га асобнага батальёна аховы і абслугоўвання лейтэнант Юлія ЗАЛУЦКАЯ. І нават наша гутарка адбываецца пад гукі рэпетыцыі чарговага канцэрта — гэтым разам да 8 Сакавіка.**



— Я прызвалася ў 2006 годзе, калі скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Кіраўнік народнага ансамбля». З таго часу я нікуды адсюль, — усміхаецца Юлія. — Акрамя як у дэкрэтны адпачынак.

Мая суразмоўніца — маці дваіх дзяцей. Дачцэ Ганне нядаўна споўнілася 12 гадоў. Сын Вова маладзейшы — яму толькі восем. Цікаўлюся — ці не хочуць дзеці пайсці па творчым шляху маці?

— Ганна ўдзельнічала разам са сваёй сяброўкай у нашым фестывалі армейскай песні, неадназарова я брала яе да нас на канцэрты. Вось незадоўга да Новага года наша канцэртная група арганізоўвала ранішнік. А ў мяне хранічна не хапала часу, каб вывучыць ролю! Ганна прыйшла на дапамогу і сыграла казачную кікімару замест мяне, — згадвае Юлія. — Атрымалася, як паслія казалі, вельмі міла. Я паглядзела, што дачка добра іграе, і мы вырашылі ўзяць яе з сабой. Паехала разам з ёй у Рудзенск, у дапаможную школу-інтэрнат. Тут я мела на ўвазе і другую мэту — каб Ганна пабывала ў школе, дзе выхоўваюцца незвычайныя дзеці. Кантакт адбыўся вельмі добра — дачка тут жа знайшла агульную мову з некаторымі выхаванцамі. Тут справа ў псіхалогіі. Бывае, што дзеці не ўспрымаюць добра сваіх аднагодкаў, якія чымсьці ад іх адрозніваюцца. Але чым жа тыя вінаваты, што з імі здарылася такое няшчасце? Ім і так шмат дзе вельмі складана. Таму, на маю думку, трэба з маленства ўкладваць разуменне, што людзі бываюць розныя, у тым ліку і з асаблівасцямі развіцця. І наша задача — дапамагчы ім інтэгравацца ў гэты вялікі свет.

Але пакуль што Ганне не да перыядычных выступленняў. Дзяўчынка вучыцца ў шостым класе, дзе ўжо прысутнічаюць складаныя дакладныя навукі. Таму на гэтым кірунку пакуль узята творчая паўза. Ёсць у яе яшчэ адно захапленне — гімнастыка, якой дзяўчына займаецца на аматарскім узроўні. А ў Вовы больш цікавасці да дзюдо.

Дапаможная школа-інтэрнат у Рудзенску стала для канцэртнай групы ВПС і войскаў ППА пунктам адліку сацыяльнага праекта «Сэрца на далоні». Музыканты выступаюць для дзяцей-сірот, анкалагічных хворых, інвалідаў і састарэлых людзей. Такім чынам яны імкнуцца звярнуць увагу на праблемы гэтых катэгорый людзей і дапамагчы ім хоць маральна, каб яны знаходзілі ў сабе сілы жыць далей. Праграма інтэрактыўная — гэта значыць, што аўдыторыя не ператвараецца выключна ў гледачоў, а ўдзельнічае ў свяце і сама.

— Помню паездку ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, — згадвае Юлія. — Гэта, па праўдзе кажучы, для мяне было самае страшнае месца. Там песні спяваць вельмі цяжка. Але калі разумееш, як дзеці зараджаюцца ад цябе, то гэта надае аптымізму. Стараемся наведваць іх раз на год. Працуюць там і бальнічныя клоўны, якія таксама падтрымліваюць малых. Таксама ў ліку нашых сяброў — Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў. У аснове нашай творчай праграмы — музычная кампазіцыя Ігара Мацвіенкі з красамоўнай і кароткай назвай «Жыць». Больш за тое, мы сваімі сіламі знялі кліп на гэтую песню, які паказваем кожны раз, калі кудысьці прыязджаем упершыню.

Юлія Залуцкая займаецца ў клубе не толькі творчасцю. Начальнік клуба аб'ядноўвае ў сабе некалькі пасад, сярод якіх — загадчык гаспадаркі, тэхнік па ўліку, бухгалтар... Штатны расклад не прадугледжвае памочнікаў. За адным выключэннем — салдата-«клубніка» з ліку тых, хто праходзіць тэрміновую службу. Без яго было б зусім складана. Але каб сюды трапіць, салдат мусіць быць таленавіты і кемлівы.

— Наш клуб будавалі ў 1939 годзе. У тыя часы чамусьці вырашылі ўзвесці будынак, як кажуць, з размахам. Ён мае тры паверхі і разлічаны на 400 пасадачных месцаў! — кажа Юлія. — Вайскоўцы ВПС і войскаў ППА прыязджаюць сюды на разнастайныя нарады і мерапрыемствы, тут праводзіцца безліч калегій, нярэдка прымаем прадстаўнікоў іншых дзяржаў. Таму, самі разумееце, работы ў нас вельмі шмат.

У клубе не так даўно з'явілася сучасная апаратура для канцэртнай залы. Працуюць на ёй салдаты тэрміновай службы, якія праходзяць праз адбор. Юлія, а таксама пастаянныя члены групы вучаць іх хітрасцям абыходжання з тэхнікай. Прычым чалавек, які працуе на пульце, павінен абавязкова валодаць ідэальным слыхам.

Ёсць у нас і выязны камплект апаратуры. Дзе ён толькі не пабываў — яго вазілі на самалётах, у цягніках, манціравалі і разбіралі на палігонах, у лясах, у балотах... Стараемся самі падтрымліваць тэхніку ў рабочым стане. Выключэнне — сур'ёзныя паломкі, якія не можам ліквідаваць самі. Тады ўжо даводзіцца прасіць дапамогі ў спецыялістаў.

— Канцэртная група ў войсках ВПС і ППА пазаштатная. Гэта значыць, што большую частку часу вайскоўцы служаць на іншых пасадах у часцях па ўсёй Беларусі. У асноўным складзе групы цяпер знаходзяцца начальнікі клубаў. Сярод іх — Настасся Турко з 147-га зенітна-ракетнага палка, Людміла Куклева з 8-й радыётэхнічнай брыгады, Алеся Кір'янава з 1073-га цэнтральнага камандНага пункта. Не так даўно тры дзяўчыны сышлі ў дэкрэтны адпачынак, і нам іх вельмі не хапае. Затое адзін з салістаў, Максім Пятухоў, плануе пасля тэрміновай службы перайсці на кантракт.

Мы збіраемся ў адзіную групу за некалькі дзён да чарговага выступлення. Таму ўсе рэпетыцыі праходзяць па ўзмоцненым графіку. І тады рабочы дзень заканчваецца позна ўвечары. Часта і сама саджуся за раяль — я ж па першай музычнай спецыяльнасці піяністка.

Складана знайсці месяц, дзе б ні было ніводнага свята, якое датычыцца нашага роду войскаў. А пры гэтым ёсць яшчэ і іншыя нагоды для выступленняў. Вось гэтымі днямі частка нашай групы адправілася ў Баранавічы, каб павіншаваць тамтэйшых жанчын у ваеннай форме з 8 Сакавіка.



***— Але як жа ў такім напружаным рэжыме ўдаецца паспяхова выконваць усе задачы?***

— Сакрэт — доўгатэрміновае планаванне і ўзаемаразуменне. Вось, скажам, я ведаю, што ў мяне ёсць вольны тыдзень без якіх-небудзь мерапрыемстваў. За гэты час я імкнуся вырашыць усе рабочыя пытанні, якія не звязаны з творчасцю, — зрабіць зверку, штосьці адрамантаваць, падрыхтаваць неабходныя дакументы. Цяпер вось два члены групы сыходзяць на сесію, і таму часова мы будзем вымушаны скарачіць колькасць выступленняў. Нават адпачынкі ў нас плануюцца на час, калі не трапляюць на буйныя мерапрыемствы і вучэнні. Проста імкнёмся адно аднаго слухаць і чуць.

***— Што самае складанае падчас службы?***

— Пастаянная ратацыя кадраў сярод салдат тэрміновай службы. Яны ж прыходзяць у наш батальён максімум на год, і тое калі іх прызвалі на 18 месяцаў. І вось толькі прывыкнеш, як ужо і развітвацца трэба. Хоць не з усімі. Напрыклад, салісты групы Сяргей Слілка і Яўген Каляіна з намі ўжо тры гады. Вельмі добры дуэт у іх атрымаўся. Прычым Сяргей спачатку адслужыў тэрміновую службу, але перыядычна да нас прыязджаў, рэпеціраваў, спяваў і... у выніку вырашыў падаца ў войска на кантракт. Як бачым, любоў да творчасці ўзяла верх. І гэта прыемна.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


**Приорбанк RBI Group**

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В.Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 27 марта 2020 года в 10.00 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА**

Собрание будет проводиться в очной форме по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 59, конгресс-холл гостиницы «Виктория».

Орган, созывающий собрание акционеров, – Наблюдательный совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению Собрания, за 20 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО, по адресу: г. Минск, ул. В.Хоружей, 31А (в рабочие дни и часы банка).

Список лиц, имеющих право на участие в Собрании, составляется на основании реестра владельцев акций «Приорбанк» ОАО по состоянию на 06.03.2020 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, будет осуществляться 27 марта 2020 года с 8.30 до 9.45 по месту проведения очередного Общего Собрания акционеров при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений об участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания и составления списка лиц, зарегистрировавшихся для участия в Собрании, содержащего подписи этих лиц.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность, представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц-акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

Повестка дня Собрания:

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2019 год.
2. Отчет Правления о работе банка за 2019 год.
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2019 год. Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2019 год; распределение прибыли за 2019 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
6. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.

Наблюдательный Совет,
Правление «Приорбанк» ОАО

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.07.2019 года. УНП 100220190


## Извещение об открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 7 апреля 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-96999 (цех по производству изделий из металлопластика) | Гродненская область, г. Гродно, ул. Аульская, д. 18Б | 273 240,00 | 27 324,00 | Без условий | Здание обрабатывающей промышленности иного назначения Составные части и принадлежности: 2 пристройки, канализационная сеть, водопроводная сеть. Год постройки – 1999. Площадь – 1178,8 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 440100000003000729 площадью 0,2570 га |
| 2* | Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18248 (турбаза) | Гродненская область, Гродненский район, Озерский с/с, а. г. Озеры, ул. Пионерская, д. 2 | 11 466,00 | 1146,60 | Без условий | Здание неустановленного назначения с составными частями и принадлежностями: пристройка (спортзал), покрытие территории, линия электропередачи 0,4 кВ, ограждение территории, трубопровод тепловой сети, трубопровод водопроводной сети, канализационная сеть. Год постройки – 1936. Площадь – 919,8 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422086505101001258 площадью 0,4018 га |
| 3* | Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18249 (котельная) | Гродненская область, Гродненский район, Озерский с/с, а. г. Озеры, ул. Пионерская, д. 2 | 882,00 | 88,20 | Без условий | Здание неустановленного назначения с составными частями и принадлежностями: уборная, труба. Год постройки – 1990. Площадь – 71,0 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422086505101001258 площадью 0,4018 га |

* - Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, тел. (0152) 720537, 720010.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

- **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 7 апреля 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 9 марта по 1 апреля 2020 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 720010. Адрес сайта: www.grodno.gov.by, gcn.by

Напярэдадні

# Спалучаць слабасць і моц

## Жанчыны прадстаўляюць амаль усе слаі грамадства

**Загадкавыя, непаўторныя, дзіўныя, эмацыянальныя, імпульсіўныя, непрадказальныя — на працягу многіх стагоддзяў мужчыны спрабавалі разгадаць таямніцу жанчыны. Чаго ж яна хоча на самай справе? Як прачытаць, што хаваецца за яе вабнай усмешкай? Якім чынам у прадстаўніц слабага полу атрымліваецца многае разумець і дараваць? Адказаць на гэтыя пытанні ўдаецца далёка не заўсёды. Мабыць, да канца ўсёй праўды пра сябе не ведаюць нават самі жанчыны. І гэта, напэўна, яшчэ больш інтрыгуе моцны пол. Між іншым, удзельніцы круглага стала «Слабая моцная жанчына», які адбыўся ў сталічным Доме прэсы напярэдадні вясновага свята, сышліся ў адным: жанчыны сёння гатовыя не толькі быць там, дзе патрэбныя іх мяккасць, міласэрнасць і спачуванне, але і скласці годную канкурэнцыю ў тых сферах, якія традыцыйна лічыліся мужчынскімі.**




Так, у Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі працуе 40 працэнтаў жанчын, а ў Савеце Рэспублікі — 25 працэнтаў. Жанчын можна сустрэць сярод міліцыянераў і ратавальнікаў. Усё больш жаночай становіцца прафесія журналіста. Так, сёння хлопцаў на факультэце журналістыкі БДУ усяго 20 %. І такая тэндэнцыя назіраецца на працягу ўжо 10 гадоў, паведаміла **дэкан факультэта Вольга САМУСЕВІЧ** падчас круглага стала.



«Цяпер хлопцы хочуць быць праграмістамі, спецыялістамі ў сферы IT-тэхналогій. Але сфера журналістыкі вельмі адказная, тут трэба быць спецыялістам не ў адной галіне. Неабходна пастаянна развівацца. Мне падаецца, гэта накладвае свой адбітак на тое, што ў нас вельмі шмат дзяўчат. Але я ўпэўнена, што не ад гэтага залежыць якасць. Галоўная рыса спецыяліста ў тым, наколькі ён аддаецца сваёй працы і наколькі разумее сваю місію», — лічыць Вольга Самусевіч.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія АНАНІЧ** заўважыла, што ў парламенце шырока прадстаўлена жаночая частка беларускага грамадства.

«Жанчыны, якія ў парламенце прадстаўляюць розныя сферы, безумоўна, дасягнулі вынікаў як у прафесійнай дзейнасці, так і ў грамадскай, бо займаюць актыўныя пазіцыі ў жыцці сваіх калектываў і рэгіёнаў. Неабыякавыя, мэтанакіраваныя, дальнабачныя, яны хочуць, каб у нашай краіне было камфортна, панавала стваральная атмасфера. Каб мы былі не проста сацыяльна арыентаванай дзяржавай, а каб імкнуліся рабіць трошкі больш для сваёй сям'і, для сваёй мясцовасці, для сваёй краіны», — сказала яна.

Па словах дэпутата, парламенцкае вымярэнне — гэта тыя гарманічныя законы, якія адказваюць інтарэсам грамадства і дзяржавы, спалучаюць іх. Сёння ў жанчын-парламентарыяў, як і ў мужчын, ідзе вельмі актыўная работа па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства.



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** разважаючы пра рэцэпты жаночага поспеху ў сучасным грамадстве, сказала пра тое, што маладым жанчынам нельга засяроджвацца толькі на сабе, што ў нас у Беларусі можа «зрабіць сябе» любая жанчына, бо ў краіне створаны ўсе ўмовы для мацярынства, прафесійнага росту, атрымання адукацыі. Конкурс «Жанчына года» паказвае, што жанчыны дасягаюць вяршынь ва ўсіх сферах, маюць актыўную пазіцыю.

Парламентарый заклікала жанчын ісці па жыцці смела, рабіць свет прыгажэй і спалучаць гэта са сваім прафесійным і асабістым ростам. Разам з тым, на думку парламентарыя, жанчыны павінны заставацца моцнымі, быць здольнымі прымаць самастойныя рашэнні і адказваць за іх, дапамагаць і быць апорай для іншых.



minsknews.by

**Загадчыца кансультатыўна-паліклінічнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Надзея МАНКЕВІЧ** расказала, што высокапрафесійны ўрач — заўсёды добры псіхолаг.

«Кожны пацыент — гэта гісторыя жыцця, а хвароба складаецца з ланцуга шматлікіх фактаў, якія ўплываюць на будучыню. Калі мы бачым, што можам падоўжыць жыццё, палепшыць яго якасць, — гэта дарагога каштуе», — падзялілася яна.

Падчас сустрэчы жанчыны згадалі Веру Ложачнік з Барысава, якая выхавала шасцярых сваіх і 27 прыёмных дзяцей. Гэта прыклад сапраўднага поспеху жанчыны, якая знайшла сваё прызванне ў любові да дзяцей.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Камфорт, крэатыў... і музыка для рагуль

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Памятаеце, як там у Дастаеўскага: прыгажосць уратуе свет? Дык чаму яна павінна ратаваць яго недзе далёка, а не канкрэтна ў нас, у Макараве? — смяецца **галоўны заатэхнік Святлана ЛЯШУК.** — Вось і мы падумалі, што найлепшая тая прыгажосць, якую створыш сваімі рукамі. Потым адыдзешся, паглядзіш, падправіш нешта, а то і пераробіш наноў. А калі сур'ёзна, то генератарам ідэй па ўладкаванні і афармленні комплексу з'яўляецца яго начальнік Андрэй Казачок, а мы падхопліваем, уседамляем і матэрыялізуем. І ўвесь час знаходзімся ў працэсе развіцця. Бо з'яўляецца нешта новае ў часопісе, у інтэрнэце, значыць, можна прымяніць у сябе, адаптаваць да нашых умоў і становішча.

Менавіта такім чынам павілася побач з уваходам у памяшканне цэлая скульптурная кампазіцыя. Цяпер любога, хто ўваходзіць, у дзвярах сустракаюць вясёлыя каровы. Тут выстаўлены цэлыя рагатыя сямействы з малымі і большымі цялятамі, да якіх прысуседзіліся прадстаўнікі пёрыстага жывёльнага свету. Ва ўсіх фігурках угадваюцца мульцяшныя героі — адна гэтая карцінка здольная ўзняць настрой. Тым больш што да свят карову могуць упрыгожыць, напрыклад, каляровымі вяночкамі. А зойдзеш у калідор — там свой незвычайны дызайн. Сцены ўпрыгожваюць не толькі прывычныя інфармацыйныя стэнды — на розных узроўнях змешчаны кветкі, на адну сцяну праецыруюць маляўнічыя пейзажы. Прымацаваны да столі вялікі бусел нагадвае пра нашу зямлю пад белымі крыламі.

Калі выпадзе зазірнуць у пакой адпачынку і прыёму ежы, нібы апынаешся ў дамашняй абстаноўцы. На першы погляд, абстаноўка праста, але зноў жа, з любоўю, з густам. І мэбля, і сурвэткі адна да адной — адразу відаць, сапраўдныя гаспадынькі руку прыклалі.

Тут, у сэнсе на комплексе, часта гучыць музыка, але не столькі для работнікаў, колькі для рагуль. Спецыяльна для іх падбіралі музыку для дойкі. Спыніліся на класічных кампазіцыях, бо заўважылі, што пры такім музычным суправаджэнні каровы лепш аддаюць малако.

А вынікі работы жывёлагадоўчы комплекс мае вельмі прыстойныя, калі без залішняй сціпласці гаварыць — лепшыя ў раёне, у тройцы лідараў па вобласці. Напрыклад, зарплата аператара машыннага даення істотна перавышае сярэднюю па краіне. Паводле слоў **начальніка комплексу Андрэя КАЗАЧКА,** ужо сёлета малочны цэх прадпрыемства перабольшвае па надоях у параўнанні з леташнім, паказчык недзе на ўзроўні 150 працэнтаў. «Удой у нас лепшы па гаспадарцы і падступае да 8 тысяч літраў на карову. 100 працэнтаў малака ідзе класам «экстра». За ўсім гэтым, вядома, стаіць штодзённая праца кожнага з калектыву, які налічвае 31 чалавек. З іх дваццаць — жанчыны. Складовымі нашага поспеху можна назваць граматную селекцыю, перадавыя тэхналогіі, якасныя



Аператары машыннага даення Наталля БАРАНЧУК і Сафія МАЗУРЫК.



кармы, — працягвае Андрэй Уладзіміравіч. — Гэта ж аграмаднае жывёлагадоўчае прадпрыемства. Цяпер на комплексе ўтрымліваецца 1601 галава буйной рагатай жывёлы, у іх ліку 500 дойных кароў. І кожная жывёліна павінна быць дагледжаная ў адпаведнасці з тэхналагічнымі, ветэрынарнымі патрабаваннямі».

Камбікорм, напрыклад, тут робяць па сваім рэцэпце, для яго нават купілі асобную размолачную машыну, якая выдае патрэбную фракцыю сумесі. Да складання рэцэптуры спецыялісты падыходзяць надзвычай адказна, карыстаюцца найноўшымі навуковымі распрацоўкамі.

Важна, што падабралася каманда аднадумцаў, якія перажываюць за справу, за калектыў. А калі вакол прыгожа, зарплата прыстойная, то і на працу хадзіць хочацца — у адзін голас кажуць жывёлаводы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**
*Камянецкі раён.*

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «КОТИКИ ХОТЯТ ВЫИГРАТЬ ПРИЗЫ ОТ WHISKAS»

Настоящие правила проведения Рекламной игры **«Котики хотят выиграть призы от Whiskas»** (далее – Правила), направленной на стимулирование реализации продукции, производимой под товарным знаком Whiskas, указанной в п. 1.7 Правил, на территории, указанной в п. 1.3. Правил, разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры **«Котики хотят выиграть призы от Whiskas»** (далее – Рекламная игра).

**1. Общие положения:**

**1.1. Организатор Рекламной игры:** белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью (далее – «Организатор») с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП101132766. Электронный адрес: igra@primary-jwt.by.

**1.2. Наименование Рекламной игры**: **«Котики хотят выиграть призы от Whiskas»**.

**1.3. Территория проведения Рекламной игры**: Республика Беларусь. Приобрести игровой продукт можно в любых объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь, реализующих Игровой продукт.

**1.4. Срок начала и окончания Рекламной игры**, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 09.03.2020 г. по 17.04.2020 г.

**1.5. Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры**: с 9 марта 2020 г. по 5 апреля 2020 г. включительно.

**1.6. Состав комиссии по проведению Рекламной игры** (далее – Комиссия):

Председатель комиссии:

• Куянцев Игорь Юрьевич, заместитель директора СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

Члены комиссии:

• Зарецкий Вячеслав Сергеевич, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Абрамович Татьяна Владимировна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Беляев Никита Юрьевич, специалист по медиапланированию Иностранного унитарного предприятия «Медиахауз»;

• Головач Светлана Александровна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО.

**1.7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (по тексту Правил – Игровой продукт):

• Корм консервированный полнорационный для кошек/котят, производимый под ТМ Whiskas, масса нетто 85 г.

**2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:**

2.1. К участию в Рекламной игре допускаются достигшие возраста 14 лет физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь (имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь).

2.2. Участником Рекламной игры не может быть член комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

2.3. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

2.4. Для участия в Рекламной игре необходимо в период времени с 9 марта 2020 г. по 5 апреля 2020 г. (включительно):

2.4.1. Приобрести в объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь 3 (три) любых Игровых продукта ТМ Whiskas, указанных в п. 1.7. Правил, в одном чеке.

Под **чеком** в настоящих Правилах понимается документ, подтверждающий факт приобретения Игровых продуктов, который должен содержать сведения об УНП (учетном номере налогоплательщика) продавца, дате продажи, наименовании, количестве и цене товара, сумме покупки. В случае отсутствия в чеке вышеперечисленных сведений покупатель дополнительно должен получить у продавца специальный купон Whiskas, в котором должна быть указана кодовая фраза.

2.4.2. Пройти регистрацию Участника на сайте www.whiskas-promo.by (далее – Сайт). Для регистрации Участника на Сайте ему необходимо заполнить следующие данные Участника в соответствующих полях регистрационной формы на Сайте: личный номер мобильного телефона оператора сотовой связи Республики Беларусь, услугами которого пользуется Участник (МТС, А1, Life:)), имя, фамилию, отчество, адрес фактического проживания Участника, а также подтвердить свое согласие с настоящими Правилами путем проставления галочки в специальном окне Сайта. После выполнения указанных действий на странице Сайта выпадает окно «Сообщение с кодом отправлено на Ваш номер». Автоматически на соответствующий номер мобильного телефона Участника, указанный им при регистрации, отправляется короткое сообщение, состоящее из 4 цифровых символов. После ввода полученного цифрового кода в соответствующее поле регистрационной формы «Введите код» Участник подтверждает заполненную форму и завершает регистрацию. В случае успешной регистрации Участника на Сайте выводится соответствующее сообщение. Регистрация Участника на Сайте производится только один раз за период проведения Рекламной игры.

2.4.3. Зарегистрировать чек на Сайте в поле «Регистрация покупки» одним из следующих вариантов:

1) отметить вариант «Чек», если чек **содержит** все необходимые реквизиты, указанные в п. 2.4.1. Правил, и прикрепить фотографию чека или

2) отметить вариант «Купон», если чек **не содержит** все необходимые реквизиты, указанные в п. 2.4.1. Правил. Далее ввести кодовую фразу, указанную в специальном купоне Whiskas, полученном согласно п. 2.4.1. Правил, в специальное окно в форме регистрации, отмеченное пометкой «Купон», и прикрепить фотографию чека или

3) отметить вариант «Евроопт», если Игровой продукт был приобретен Участником в торговой сети «Евроопт», и прикрепить фотографию чека.

2.4.4. Сохранить оригинал чека до окончания Рекламной игры.

2.5. Участники, которые в период с 09.03.2020 по 05.04.2020 (включительно) приобрели Игровой продукт в торговой сети «Евроопт» и выполнили иные условия участия в игре согласно п. 2.4.1. – 2.4.4. Правил, принимают участие также в розыгрыше Дополнительных призов, предусмотренных в п. 3.2. Правил.

2.6. Один и тот же номер мобильного телефона может быть использован для регистрации покупок только одного Участника.

**3. Состав и размер призового фонда и источники его формирования:**

3.1. Призовой фонд Рекламной игры формируется Организатором в размере 11 065,95 (одиннадцать тысяч шестьдесят пять белорусских рублей и 95 копеек). Источником формирования призового фонда являются денежные средства и имущество Организатора.

3.2. Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы (выигрыши), перечисленные ниже в Таблице № 1.

*Таблица № 1:*

| | Наименование призов | Количество, шт. | Цена за 1 единицу, бел. руб. | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Еженедельный приз:** Денежный приз в сумме 100 (сто) белорусских рублей. **Далее – Еженедельный приз** | 24 | 100,00 | 2 400,00 |
| 2. | **Дополнительный приз 1:** Планшет Apple Ipad Air 64GB LTE стоимостью 1 794,97 белорусского рубля, а также денежные средства в размере 247,30 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. **Далее – Дополнительный приз 1** | 1 | 1 794,97 | 2 042,27 |
| 3. | **Дополнительный приз 2:** Apple Iphone 11 Pro 64GB стоимостью 2 799,00 белорусского рубля, а также денежные средства в размере 397,32 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. **Далее – Дополнительный приз 2** | 1 | 2 799,00 | 3 196,32 |
| 4. | **Главный приз:** Денежный приз 3 000 белорусских рублей, а также денежные средства в размере 427,36 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. **Далее – Главный приз** | 1 | 3 427,36 | 3 427,36 |

**4. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:**

4.1. Розыгрыши призов проводятся в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2.

4.2. Розыгрыши призов проводятся следующим образом:

4.2.1. Розыгрыши Еженедельных призов проводятся согласно Таблице 2 среди Участников, которые, выполнив условия участия в Игре, зарегистрировали чеки на Сайте в соответствующий период времени.

*Таблица 2: розыгрыши Еженедельных призов*

| № | Дата и время розыгрыша: | Розыгрыши проводятся среди Участников, которые зарегистрировали на Сайте чеки в период: |
|---|---|---|
| 1 | 17 марта 2020 г. в 15.00 | с 00:00:00 9 марта по 23:59:59 15 марта 2020 г. |
| 2 | 24 марта 2020 г. в 15.00 | с 00:00:00 16 марта по 23:59:59 22 марта 2020 г. |
| 3 | 31 марта 2020 г. в 15.00 | с 00:00:00 23 марта по 23:59:59 29 марта 2020 г. |
| 4 | 7 апреля 2020 г. в 15.00 | с 00:00:00 30 марта по 23:59:59 5 апреля 2020 г. |

В каждом розыгрыше разыгрывается по шесть Еженедельных призов.

4.2.2. Розыгрыши Дополнительных призов производятся согласно Таблице 3 среди Участников, приобретших Игровой продукт в торговой сети «Евроопт» и выполнивших условия участия в игре согласно п. 2.4. Правил в период с 9 марта по 5 апреля 2020 года (включительно).

*Таблица 3: розыгрыши Дополнительных призов*

| № | Наименование приза: | Дата и время розыгрыша: | Розыгрыши проводятся среди Участников, которые зарегистрировали на Сайте чеки в период: |
|---|---|---|---|
| 1 | Дополнительный приз 1 | 7 апреля 2020 г. в 15:30 | с 00:00:00 9 марта по 23:59:59 5 апреля 2020 г. |
| 2 | Дополнительный приз 2 | 7 апреля 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 9 марта по 23:59:59 5 апреля 2020 г. |

4.2.3. Розыгрыш Главного приза проводится 7 апреля 2020 года в 16:00 среди всех Участников, которые выполнили условия участия в Рекламной игре в соответствии с п. 2.4. Правил в период времени с 09.03.2020 по 05.04.2020 г. включительно.

4.3. До начала каждого розыгрыша Комиссия составляет списки Участников, которые выполнили условия п. 2.4. Правил в соответствующий период времени и имеют право участвовать в соответствующем розыгрыше с указанием Порядкового номера регистрации, фамилии, имени, отчества Участников, а также даты и времени регистрации чека на Сайте.

Порядковый номер регистрации присваивается каждому зарегистрированному чеку Участника в хронологическом порядке в зависимости от даты и времени регистрации чека на Сайте.

4.4. Для каждого розыгрыша Организатором используется лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9. Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем их формирования справа налево из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого справа разряда выигрышного порядкового номера помещаются в лототрон шары с номерами от 0 по первую справа цифру последнего порядкового номера Участника игры в списке. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый справа разряд формируемого выигрышного номера. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, в соответствующий разряд выигрышного номера.

Подобным образом шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадет в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в списке Участников.

Участник, на чей зарегистрированный порядковый номер регистрации приходится сформированный выигрышный номер, является Победителем, имеющим право на получение соответствующего приза.

Таким образом определяются Победители всех розыгрышей.

Каждый Участник может выиграть не более одного (любого) приза за весь период проведения Рекламной игры. В случае если в результате последующих розыгрышей на данного Участника (Победителя, ранее выигравшего какой-либо приз Рекламной игры) приходится новый выигрыш, то данному Участнику второй выигрыш не выдается, а для определения Участника, имеющего право на получение этого выигрыша, проводится повторный розыгрыш в порядке, предусмотренном п. 4.4. Правил.

**5. Срок и способ информирования Победителей:**

5.1. Победители извещаются о выигрыше посредством отправки SMS-сообщения на номер мобильного телефона, указанный ими при регистрации на Сайте, в срок не позднее 8 апреля 2020 года. Также Организатор оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом: телефонным звонком, почтовым отправлением и др.

**6. Место, порядок и срок выдачи выигрышей:**

6.1. Для получения Дополнительных призов Победителям необходимо не позднее 16 апреля 2020 г. явиться в офис Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2 (режим работы Организатора по выдаче призов: рабочие дни – с 10.00 до 17.00, суббота 11 апреля 2020 года – с 10.00 до 13.00), предварительно связавшись с Организатором по телефону + 375 29 513 46 94 (звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник), предоставить документ, подтверждающий личность (паспорт или вид на жительство), оригиналы зарегистрированных чеков, на регистрацию которых пришелся выигрыш. Призы выдаются Организатором Победителю в день обращения при условии соблюдения Победителем правил Рекламной игры.

6.2. Для получения Еженедельных призов и Главного приза Победителю необходимо не позднее 16 апреля 2020 г. явиться в офис Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2 (режим работы Организатора по выдаче призов: рабочие дни – с 10.00 до 17.00, суббота 11 апреля 2020 года – с 10.00 до 13.00), предварительно связавшись с Организатором по телефону + 375 29 513 46 94 (звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник), предоставить документ, подтверждающий личность (паспорт или вид на жительство), оригинал зарегистрированного чека, на регистрацию которого пришелся выигрыш, а также Договор, подтверждающий наличие у Победителя счета в белорусских рублях, заключенный Победителем с одним из банков Республики Беларусь, оформить (подписать) документы, связанные с выдачей приза. После этого Организатор выдает приз путем перечисления причитающихся к выплате Победителю денежных средств в безналичном порядке на счет соответствующего Победителя в срок не позднее 17 апреля 2020 г.

6.3. При невыполнении Победителями условий и сроков получения призов, иных условий участия в игре, предусмотренных в настоящих Правилах, Победитель может быть лишен права на получение соответствующего приза.

6.4. Организатор при выдаче Дополнительных и Главного призов, признается налоговым агентом и удерживает из денежной части приза подоходный налог, причитающийся к уплате Победителями в связи с получением приза.

6.5. Получение призов несовершеннолетними Победителями осуществляется с письменного согласия законных представителей несовершеннолетних, чьи полномочия должны быть надлежащим образом подтверждены перед Организатором.

6.6. Организатор не оплачивает Победителям расходы, связанные с проездом к месту получения приза или в офис Организатора.

6.7. В случае если Победитель не может явиться в офис Организатора для совершения предусмотренных Правилами процедур лично, соответствующие действия может совершить от его имени его доверенное лицо по предъявлении документа, удостоверяющего личность, и надлежащим образом заверенной доверенности, а также товарного чека, на который пришелся выигрыш.

6.8. Призы не подлежат выдаче Участнику иначе как в порядке, предусмотренном Правилами. В случае отказа Участника от получения приза, невыполнения Участником требований настоящих Правил или неполучения им приза в установленные сроки и в установленном порядке, Участник теряет право на получение приза, и причитающийся Победителю приз остается у Организатора. Призы не могут быть востребованы Победителями повторно, денежная компенсация им не выплачивается.

**7. Прочие условия:**

7.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

7.2. Результаты проведения Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» не позднее 10 апреля 2020 г.

7.3. Информацию о Правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Сайте www.whiskas-promo.by, а также по телефону горячей линии (телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры): +375 17 239 07 22 с 10.00 до 18.00 ежедневно без выходных. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник.

7.4. Организатор не несет ответственности за:

7.4.1. Ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры и за достоверность сведений и персональных данных, указанных Участниками при регистрации.

7.4.2. Невозможность связаться с Участником в случае недостоверности информации, предоставленной Участником.

7.4.3. Невыполнение (несвоевременное выполнение) Участниками обязанностей, связанных с участием в Рекламной игре и получением призов.

7.4.4. Неознакомление Участников с настоящими Правилами и условиями участия в Рекламной игре, а равно их неознакомление с результатами проведения Рекламной игры.

7.4.5. Неполучение (несвоевременное получение) от Участников документов и/или сведений, необходимых для получения призов.

7.4.6. За работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику) и операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

7.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору.

7.7. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники согласны с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

*Свидетельство No 3757 о государственной регистрации Рекламной игры выдано 2 марта 2020 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

## Настасся ЯЦЭВІЧ:

# «30 кіламетраў ідзеш, а 20 церпіш»

### Хадакі пераадольваюць каля 400 км у месяц, 50 з іх — за чатыры гадзіны. Што адчувае арганізм, і як аднаўляецца пасля падобнага стрэсу

**Настасся ЯЦЭВІЧ у спартыўнай хадзе ўжо 20 гадоў, за яе спінай дзве Алімпіяды, чэмпіянаты свету і Еўропы. Яна выступала на дыстанцыях 5, 10, 20, 35 км, а потым перайшла на 50 км. Сёлета адзін з галоўных стартаў для Настассі — камандны чэмпіянат свету, які ўпершыню ў гісторыі прыме Мінск. Па вуліцах нашага горада пройдуць найлепшыя хадакі з 50 краін. У перыяд падрыхтоўкі да гэтага турніру ўраджэнка Омска, якая ў дзяцінстве пераехала ў беларускі гарадскі пасёлак Акцябрскі, падрабязна расказала пра гэты від спорту. Што адчувае спартсмен на дыстанцыі 50 км, чаму некаторыя страчваюць прытомнасць і чым харчуюцца хадакі ў гэты час?**



## «Паказаць усё найлепшае дома»

***— Анастасія, расказыце, які старт сёлета будзе для вас у прыярытэце?***

— Для многіх самым галоўным стартам будуць Алімпійскія гульні, але для нас, мне здаецца, на роўных з ім будзе і чэмпіянат свету, які пройдзе ў маі ў Мінску. Для хады гэта вялікая падзея, магчымасць паказаць і сябе, і твар краіны. Я мэтанакіравана рыхтуюся да яго. Ужо прайшоў адзін збор у Турцыі, ішла там 20 км, хацела паглядзець сваю гатоўнасць. 50-кіламетровыя дыстанцыі я хаджу ўжо два гады, але адчуваю, што яшчэ не самарэалізавалася, таму настроена на гэты чэмпіянат. Тут не трэба праходзіць акліматызацыю, проста патрабуецца сабрацца, падрыхтавацца і паказаць усё найлепшае дома.

***— Дзве алімпійскія ліцэнзіі ў хадзе ў беларусак ужо ёсць, але ад краіны могуць удзельнічаць тры спартсменкі. Прэтэндуеце на пуцёўку?***

— Цяпер я рыхтую сябе да 50 км, таму толькі пасля чэмпіянату свету буду спрабаваць адбірацца на Алімпійскія гульні. Не хачу фарсіраваць падзеі, я яшчэ не ў ідэальнай форме, хоць зразумела, што кожнаму хацелася б паехаць на Гульні.

***— Што галоўнае ў хадзе: тэхніка, генетыка, падрыхтоўка?***

— Мне здаецца, усё. Псіхалогія, фізіка, медыцына — трэба, каб склалася ўсё адразу. Трэніруюцца ўсе, перамагчы жадаюць усе, але выйграе той, у каго ў пэўны дзень супадуць усе фактары. Генетыка таксама важная: хтосьці спрынтар, хтосьці больш схільны да цягавітасці — ад гэтага таксама залежыць многае, але гэта можна вызначыць яшчэ ў дзяцінстве, нават візуальна, па размяшчэнні і выглядзе цягліц.

***— У вашым відзе спорту часта даводзіцца праяўляць і цярпенне, і характар, і працавітасць. У які момант хады на 50 км трэба пачынаць пераадольваць сябе?***

— Як кажа мой трэнер, 30 кіламетраў ідзеш, а 20 церпіш. Вельмі заманліва бывае на 32—34 кіламетры, здаецца, што ты ўсё можаш, такі свежанькі, а потым цябе накрывае так, што апошнія пяць кіламетраў можаш наогул не дайсці. Таму першыя 30 лепш ісці спакойна, а потым цярпець і не тузацца. Калі становіцца цяжка, разумееш, што такое адчуванне ва ўсіх, спрабуеш сябе ўгаворваць, здараецца, што кожны крок угаворваеш сябе. Калі пераадолееш гэты пераломны момант, то ўжо адкрываецца другое дыханне. А бывае, не адкрываецца, тады гэта называецца «напакутаваўся».




***— Памятаеце, як вам даліся першыя 50 кіламетраў?***

— Гэта было ў Кітаі, на камандным чэмпіянаце свету, і я паказала там нядрэнны вынік — 9-е месца. Гэта было незразумела, таму што я не ведала, чаго чакаць, — можа быць, таму і не было дужа складана. Потым на чэмпіянаце Еўропы я вельмі добра была гатова, ішла чацвёртая, даганяла чэмпіёнку свету — партугалку, але суддзі вырашылі мяне прытрымацьчы, далі пяць хвілін штрафу. Спартсменка з Партугаліі была лідарам сезона і проста павінна была выйграць любымі шляхамі. У нас ад судзейства залежыць многае, таму што від спорту тэхнічны. Тады я нахапала шмат картак літаральна за 500 метраў. Па сутнасці, прычапіцца можна да любога спартсмена. Суддзі размешчаны на дыстанцыі праз кожныя 300 метраў, усіх мы ведаем ужо ў твар, ведаем, ад каго чаго можна чакаць. Часам судзяць вельмі лаяльна, а бывае, што ўсе як адзін вельмі злыя.

## «Памятаю, упала, але ўстала і пайшла далей»

***— Што адчувае арганізм на працягу гэтых 50 кіламетраў, ці бываюць нечаканыя сітуацыі са здароўем?***

— Так, можна хутка пачаць, тады арганізм уміг закісляецца і ламаецца, ад гэтага маладыя спартсмены часта не даходзяць да фінішу або падаюць. Другая прычына — не ідзе харчаванне. Мы ж харчуемся па ходзе дыстанцыі рознымі энергетычнымі напоямі, але яны могуць не падысці, і тады страўнік спыняецца, спартсмена пачынае ванітаваць. У моцную спякоту арганізм блакіруецца, уключае сваю ахоўную функцыю, каб чалавек не памёр. І тады спартсмен страчвае прытомнасць. Гэта не слабасць, як многія думаюць, а элементарная абарона, прыдуманая прыродай. У мяне было такое перад Алімпіядай у Рыа. Памятаю: іду і раптам на 15-м кіламетры пачынае цямнець у вачах, сама не разумею чаму. Пачынаю сябе пераконваць, што трэба сабрацца. Я нават упала, мой трэнер ужо выключыў секундамер, але ў падсвядомасці ў мяне было, што трэба ўстаць і скончыць дыстанцыю, я ўстала і пайшла. Самае цяжкае — гэта калі ты не гатовы выходзіць на старт, яшчэ не зрабіў усю работу для гэтага, а цябе, як кацяня, кідаюць у барацьбу. Гэта цяжка і псіхалагічна, і фізічна.

***— Колькі часу трэба для аднаўлення арганізма пасля 50-кіламетровай дыстанцыі?***

— Месяц, пяць тыдняў. Трэба каб усе крывяныя цельцы, якія зламаны, аднавіліся, прыйшлі ў норму мышачныя звязкі, суставы, не кажучы ўжо пра галаву, таму што пасля старту, як бы ты ні выступіў, добра ці дрэнна, — ты знясілены. Калі выйграў, здаецца, усё добра, але ўсё роўна ты псіхалагічна выпустошаны, трэба зноўку запоўніць гэтую ўнутраную пустэчу і са смакам пайсці на трэніроўку.

У гэты месяц мы ўсё роўна трэніруемся, але ўжо ў сваё задавальненне, бегаем, плаваем, хадой не ходзім, каб адцягнуцца. Я люблю пры гэтым яшчэ памяняць абстаноўку, паехаць на іншую трасу або пабегаць у зале, таму што арганізм усё роўна ж памятае, як ты на гэтай трасе паміраў. Нават хадоўкі, у якіх раблю складаныя трэніроўкі, не абуваю нейкі час.

***— Якія ўмовы самыя складаныя для хады?***

— Самае складанае надвор'е для нас — спякота, напрыклад, якая была на чэмпіянаце свету 2019 года ў Досе. Людзі там проста падалі. А так — мы хадзілі і пад дажджом, і ў вецер. У нас жа ў Беларусі няма такіх паўднёвых гарадоў, у якіх можна было б праводзіць спаборніцтвы вясной у камфортных умовах. Так што летась за дзень да старту ў Гомелі чысцілі трасу ад снегу, а нам у трусах трэба ісці. Хадакам абавязкова трэба выступаць у кароткай форме, каб суддзі бачылі калена. Але па холадзе ўсё роўна лягчэй хадзіць, чым у спякоту.

***— Які ўзрост найбольш падыходзіць для добрых вынікаў у хадзе?***

— Мне здаецца, пачынаючы з 25-28 і да 40 гадоў. У нас жа цыклічны від спорту, таму я назіраю, што свае найлепшыя вынікі людзі паказваюць і ў 35, і ў 40 гадоў. Ёсць іспанец, якому ўвогуле 50, і ён яшчэ ходзіць на роўных са многімі. Тут вялікую ролю адыгрывае вопыт, калі ты псіхалагічна і фізічна напрацаваны.

***— Ці лічыце, колькі кіламетраў вы праходзіце за сезон?***

— За сезон — не ведаю, але, напрыклад, за гэты месяц у мяне 360 кіламетраў, бывае і па 400—420.

## «Дзяцінства праходзіла ў асноўным на стадыёне»

***— Вы нарадзіліся ў Омску, але пераехалі ў беларускі Акцябрскі. Цяпер адчуваеце сябе беларускай?***

— Вядома. Але ў Расіі таксама вельмі камфортна сябе адчуваю, знаходжу агульную мову з расіянамі, хоць паміж нашымі народамі ёсць невялікая розніца.

***— Успомніце, як праходзіла ваша дзяцінства ў Акцябрскім.***

— Вельмі весела, у мяне ёсць яшчэ два браты — старэйшы і малодшы. Тата заўсёды працаваў трэнерам у мясцовай спартыўнай школе, таму дзяцінства праходзіла ў мяне галоўным чынам на стадыёне. Тата забіраў з садка і вёў з сабой на работу. Выдатна памятаю — більярд, тэніс, бегавыя дарожкі. Лета — гэта рэчка, возера: у нас жа не было камп'ютараў, таму ўвесь час праводзілі на вуліцы. У двары былі ў асноўным хлапчукі, таму я гуляла з імі ў футбол, баскетбол, казакоў-разбойнікаў. Раніцай то абліваліся халоднай вадой, то бегалі кросы, было такое, што кожны вечар адцiскалiся з братамі на час. Я настолькі натрэніравалася, што калі прыйшла ў вучылішча, устанавіла рэкорд — адціскалася каля 100 разоў.

***— Атрымліваецца, бацька — ваш першы трэнер?***

— Так, у нас у спартыўнай школе ён выкладаў не толькі лёгкую атлетыку, але і настольны тэніс. Я не асабліва разглядала прафесійны спорт для сябе, у мяне былі то гурткі вязання, то танцы, а тата пастаянна нагадваў, што сёння трэніроўка. Пазней, калі пачалі ездзіць на спаборніцтвы, мне стала падабацца, з'явілася цікавая кампанія.

***— Вам не здавалася, што хада — даволі сумны спорт, той жа настольны тэніс нашмат цікавейшы?***

— Для дзіцяці так, але тата ў мяне матэматык-фізік, таму ў яго лагічны склад розуму. Калі ён бачыў, як я гуляю ў тэніс, не разумеў, як можна не разлічыць, дзе падбіць шарык, як яго падсекчы, як не звярнуць увагі на траекторыю. А я стаяла і проста махала гэтай ракеткай. Тата казаў, што гэта ганьба, а не гульня. Там, дзе трэба лагічнае мысленне, у мяне нічога не атрымлівалася, а вось там, дзе трэба было бегаць, скакаць, праблем не было. Потым проста не было каму выступаць на спаборніцтвах, і тата сказаў: «Ідзі ты, паспрабуй у хадзе». У мяне даволі хутка ўсё стала атрымлівацца, першы раз заняла трэцяе месца. А дзіцяці што трэба? Медаль ды грамата.

***— Якія ў вас планы цяпер? Вы казалі, што, магчыма, гэтая Алімпіяда стане для вас апошняй.***

— Цяжка вырашыцца на сыход — думаеш, можна ж зрабіць перапынак і паспрабаваць вярнуцца да Парыжа. Я не буду загадваць. Цяпер хачу рэалізаваць сябе на чэмпіянаце свету, а далей буду глядзець. Вядома, ужо нейкія мікратраўмы турбуюць перыядычна, матываваць сябе ўвесь час таксама складана. Да таго ж цяпер я хачу ўжо і сям'ю, і дзяцей. Хтосьці можа сумяшчаць гэта з прафесійным спортам, але для мяне гэта не варыянт. Я не ўяўляю, як пакіну сваё дзіця і паеду на зборы на месяц-два і не буду кантраляваць і бачыць, што там адбываецца. Хачу, каб у майго дзіцяці была мама, каб яно не думала, што яна жыве ў камп'ютары, у скайпе.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

## Аляксей ШУТАЎ:

# «Тут іншае адчуванне зямлі»

**Ён ніколі не апавядаў пра шкілеты ў шафе як артыст, але вырашыў зрабіць гэта як рэжысёр. У сакавіку Аляксей ШУТАЎ прадставіць у Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры спектакль-інтэрактыў «Шкілеты», дзе прапануе паразважаць пра тое, наколькі варта давяраць блізкім і ці можна ім хаваць свае сакрэты. Вядомы па работах у расійскіх ды ўкраінскіх фільмах і серыялах акцёр вырашыў паспрабаваць сябе ў якасці рэжысёра ў Беларусі. Саспеў?..**

— Прычын, чаму я на гэта рашыўся, шмат. Напэўна, кожны артыст, знаходзячыся па другі бок ад рэжысёра, задаецца пытаннямі, чаму ўсё менавіта так і што адбываецца ў галаве творцы, таму гэтым спектаклем я закрываю гештальт. Дзякуй тэатру, што дазволіў мне ажыццявіць гэтую пастаноўку. Упершыню ў жыцці я лезу ў мутную ваду, не асэнсаваўшы, чаму гэта раблю, і ўжо ў працэсе разумею, што не ўзяў з сабой маску з ластамі і не ўмею плаваць пад вадой. Але калі ўжо нырнуў, трэба вучыцца існаваць у гэтай стыхіі. Спрыяльныя ўмовы стварае тое, што з занятымі ў пастаноўцы артыстамі мы ведаем адно аднаго не першы год, бо не ў адным спектаклі разам працавалі на сцэне. Чалавечыя адносіны важныя для мяне ў першую чаргу, у тым ліку ў прафесіі.

***— Хіба не патрэбная дыстанцыя паміж рэжысёрам і акцёрамі?***

— Яе адсутнасць мне не перашкаджае, таму што я ўсё ж не рэжысёр. Сутыкнуўшыся з пэўнымі праблемамі, я зразумеў, што каб быць рэжысёрам, трэба мець больш ведаў і навыкаў.

***— У вас ёсць досвед работы і ў тэатрах, і ў кіно, вы бачылі розную рэжысуру...***

— Менавіта таму, што пабачыў шмат варыянтаў работы з акцёрамі, я, магчыма быць, і адважыўся паставіць сябе на месца рэжысёра. Натуральна, мне як акцёру хацелася б, каб рэжысёр працаваў са мной, маючы поўную карціну таго, што робіць, і плануючы хады на некалькі крокаў уперад, бо ў нейкім сэнсе ён стварае асобны свет. Сам я гэтага прапанаваць артыстам не магу, хоць і прыйшоў са сваёй ідэяй, якая сфарміравалася ў пэўную канцэпцыю. Калі я планаваў спектакль, быў гатовы да таго, што ўсё зменіцца ў залежнасці ад канкрэтных артыстаў, і дзякуй богу, што не распланаваў усё дасканала, бо менавіта так і адбываецца. Імгненна загараюся ад прапаноў акцёраў — часам яны мне падабаюцца нават больш, чым тое, што я меркаваў рабіць сам. Бывае, трапляю ў ступар, калі мая ідэя ламаецца з-за таго, што прапаноўваюць выкапаўцы, і я не ведаю, што з гэтым рабіць. Прытым яны патрабуюць, каб я дакладна фармуляваў задачы, меў лагічныя адказы і мог патлумачыць, што канкрэтна павінна адбывацца на сцэне.

***— У вашым жыцці былі такія рэжысёры, метад работы якіх вы хацелі б пераняць?***

— Аднойчы давялося працаваць з Аляксандрам Агаровым. Вось гэта было вельмі маё: сапраўднае мастацтва — шматпланавае, непрамалінейнае. Вельмі падабаецца, як з артыстамі працуе Віктар Шаміраў, але ў нас не знайшлося агульных пунктаў. Было цікава, калі мы рыхтавалі спектакль з французскім рэжысёрам Крыстофам Фер'е ў Маскве. У яго была адметная ідэя, канцэпцыя, стылістыка, ён прынасіў вялікую колькасць матэрыялу для абмеркавання, мы засяроджана працавалі з тэкстамі. Карысны досвед.

***— Работа ў кіно дала разуменне прыёмаў кінарэжысуры?***

— Па вялікім рахунку ў тэатральнага і кінаакцёра адна методыка працы. Я больш люблю тэатр — ён рознапланавы, не абавязкова бытавы, у той час як кіно ў асноўным паказвае пабытавыя гісторыі. Нейкія авангардныя ці абсурдыцкія фільмы, што здараліся ў кінамастацтве ад пачатку яго існавання, не атрымалі плённага развіцця, хоць на ад часу нешта такое і з'яўляецца. Кіно больш камерцыйнае мастацтва, а за час існавання ў фармаце тэлебачання наогул скіравалася на задавальненне імгненных запытаў. Цяпер ідзе новы віток развіцця кінематографа, у тым ліку і таму, што тэлебачанне ўжо не з'яўляецца адзіным даступным сродкам баўлення часу. Дзякуючы інтэрнэту людзі сталі разумець, наколькі значны іх уласны погляд і што любы чалавек можа нешта выказаць, запісаць, зняць і паказаць усім. Кіно пачынае нервавацца, шукаць новыя хады і фарматы свайго існавання.

***— Гледачы больш ведаюць вас па кіно, чым па тэатры...***



Аляксей Шутаў вучыўся на акцёрскім факультэце УДІКа (майстэрня А. Джыгарханяна і А. Філозава). Служыў у тэатры пад кіраўніцтвам Армена Джыгарханяна, у «Цэнтры драматургіі і рэжысуры» Міхаіла Рошчына і Аляксея Казанцава, у тэатры «Чалавек». Вядомы гледачам па акцёрскіх работах больш чым у 20 фільмах (сярод іх «Сібірскі цырульнік» М. Міхалкова, «Пецярбургскія таямніцы», «Бедная Насця», «Выклік», «Вяртанне Мухтара» і іншыя). З 2017 года — акцёр Беларускага дзяржаўнага Маладзёжнага тэатра.

— У тэатры я працаваў не так актыўна. Вялікіх маскоўскіх тэатраў я не захапіў, ды і не імкнуўся туды трапіць: здымкі забіралі час. Але ў той жа час тэатр я ніколі не пакідаў: працуючы ў кіно, стараўся раз на месяц іграць спектаклі. Магчыма, рэдкая падпітка выпеставала галаданне па тэатры, а я заўсёды быў яго фанатам, я люблю яго як з'яву, захапляюся ім як глядач, у мяне ёсць любімыя рэжысёры, калектывы, спектаклі. І калі мне падабаецца, я гатовы без аніякай зайздрасці крычаць: «Люблю пастаноўкі, у якіх мяне няма!»

***— Колькасць тэатральных падзей у Маскве значна большая, чым ва ўсёй Беларусі. Але вы пераехалі сюды. Чаму?***

— У апошнія гады беларускі тэатр атрымаў жывы глыток за кошт недзяржаўных праектаў. Зразумела, што гэта адбывалася і з маскоўскім тэатрам, і з кіеўскім, але тут гэта робіцца не горш — жыццё ж ідзе, падштурхоўвае да асэнсавання. Мяне сюды прывялі асабістыя абставіны, да таго ж я не маю эгаістычнай мэты стаць крутым акцёрам і дасягнуць неймаверных заробкаў, інакш бы застаўся ў Маскве. Для мяне прыватнае жыццё чалавека важнейшая за прафесію і сацыяльную пазіцыю. Прафесію і нават краіну можна памяняць, калі гэтага патрабуе твая сямейная гісторыя. Адыграла сваю ролю і тое, што я люблю Беларусь з моманту, як упершыню трапіў сюды на пачатку 90-х. З часам я зразумеў, дзе мне больш камфортна і што Масква — не мой горад, хоць там і крута працаваць, калі трэба ўзляцець па кар'ернай лесвіцы. Але не ўсё гэтым вымяраецца.

***— Выбудоўваючы свой лёс з дзяцінства, якое прайшло ў Якуціі, вы фактычна перасякалі палову зямнога шара. Ці істотная для сучаснага чалавека розніца менталітэтаў, культурных кантэкстаў?***

